УДК 821.161.3.614

Навуч. А.С. Грышукова, М.С. Яцэвіч
Навук. кір. А.К. Пекач, настаўнік беларускай мовы і літаратуры, настаўнік-метадыст (ДУА "Ліцэй № 2 г. Мінска")

# ЭФЕКТ ПАДМАНУТАГА ЧАКАННЯ Ў ПУНКЦІРАХ АЛЕСЯ РАЗАНАВА

Эфект падманутага чакання ў беларускім мовазнаўстве не быў аб'ектам навуковага даследавання. Адносна нядаўна гэта праблема стала асвятляцца ў асобных навуковых артыкулах Т.Я. Старасценкі. У рускай і ўкраінскай сучаснай лінгвістыцы, нягледзячы на вялікую цікавасць да праблемы, адназначнага тлумачэння эфекту падманутага чакання так і няма.

Эфект падмнутага чакання вывучаецца стылістыкай дэкадавання як прыём вылучэння. І.У. Арнольд лічыць, што стылістыка дэкадавання "звяртае ўвагу найперш на тое, што ў тэксце ўжо сказана, а не на тое, што, магчыма, хацеў сказаць аўтар, паколькі аўтар далёка не заўсёды можа рэалізаваць сваю задуму" [1, с. 61]. У "Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў" адзначаецца, што "ў межах стылістыкі дэкадавання даследуецца мэтанакіраваная праца пісьменніка над мовай твораў" [4, с. 291]. Мы бяром за аснову вывады І.У. Арнольд і Т.Я. Старасценкі, што эфект падманутага чакання – гэта, найперш, прыём вылучэння сэнсавых момантаў твора ў стылістыцы дэкадавання.

Вядома, што пры дэкадаванні тэксту чытачом губляецца некаторая частка інфармацыі. Пазбегнуць гэтага дазваляюць "прыёмы вылучэння пэўных сэнсавых сегментаў, важных для аўтара" [4, с. 290]. Як адзначае Т.Я. Старасценка, да прыёмаў вылучэння адносяцца канвергенцыя, счапленне і эфект падманутага чакання. Вядома, што эфект падманутага чакання заснаваны на прадказальнасці і парушэнні прадказальнасці. І.У. Арнольд вызначыла сутнасць гэтага тыпу вылучэння: 1) бесперапыннасць, лінейнасць маўлення азначае, што з'яўленне кожнага асобнага элемента падрыхтавана папярэднім і само рыхтуе наступныя. Частка наступнага ўтрымліваецца ў папярэднім. Пры такой сувязі пераходы ад аднаго элемента да другога малапрыкметныя, свядомасць як бы "слізгае" па ўспрымаемай інфармацыі; 2) калі ўзнікае парушэнне бесперапыннасці (а такое і ўзнікае пры наяўнасці эфекту падманутага чакання), яно дзейнічае як штуршок: непадрыхтаванае і нечаканае стварае супраціўленне ўспрыняццю, а

пераадоленне гэтага супраціўлення патрабуе намагання ад чытача, таму і мацней на яго ўздзейнічае [1, с. 36].

Асноўнай мэтай работы з'яўляецца даследаванне эфекту падманутага чакання ў пункцірах Алеся Разанава з анталогіі "Такая і гэтакі: талакуе з маланкай дождж", выдадзенай у 2018 годзе. Мы выявілі стылістычныя і сінтаксічныя сродкі выражэння эфекту падманутага чакання, якія садзейнічаюць стварэнню нябачнай, але даволі моцнай сувязі паміж аўтарам і чытачом, дапамагаюць зразумець твор, засяродзіць увагу і ўзмацніць цікавасць на пэўным істотным моманце.

У пункцірах А. Разанава адчуць эфект падманутага чакання дапамагаюць такія стылістычныя фігуры, як аксюмаран, антытэза, амфітэза, антыменабала, акратэза, альтэрнатэза, дыятэза.

Аксюмаран пабудаваны на супрацьлеглых паняццях, якія палярна характарызуюць адзін аб'ект ці з'яву рэчаіснасці, і, як мы высветлілі, рэалізуецца на ўзроўнях словазлучэння: *І вабяць, і мігацяць / агні / на тым баку возера: /* ***у нерухомым / палёце*** *ноч* [2, с. 123], сказа: ***Нямое загаварыла!..*** *– / Зазелянеў / рунню палетак* [2, с. 92], спалучэння слоў: ***Бяжыць – а на месцы:*** */ яліны / удумваюцца ў ручай* [2, с. 136].

Антытэза заснавана на палярным супастаўленні супрацьлеглых вобразаў, з'яў, прыкмет ці дзеянняў. Сярод розных па сэнсе антытэз у пункцірах А. Разанава мы выдзелілі наступныя катэгорыі: *жыццё – смерць, маладосць – старасць, голас – немата, светлы – цёмны, усё – нічога, радасць – смутак, дзень – ноч, ёсць – няма*. Сярод вызначаных намі катэгорый асабліва выразны кантраст назіраецца ў групе "жыццё – смерць", і менавіта ў яе складзе колькасць пункціраў найбольшая: ***Бярэзіна ўсохла****, / а ў вершаліне / красуе* ***зялёная амяла****: / пераможца лёсу?!.* [2, с. 64].

Намі заўважана, што ў пунктірах А. Разанаў сумяшчае і дзве стылістычныя фігуры – аксюмаран і антытэзу: *Акрыла наўколле шэрань: /* ***кветкі паніклі****, /* ***камень зацвіў*** [2, с. 46].

Амфітэза, антыменабала, акратэза, альтэрнатэза, дыятэза з'яўляюцца стылістычнымі фігурамі кантрасту, якія "адрозніваюцца значэннем і сінтаксічнай арганізацыяй" [3, с. 12] і таксама дапамагаюць адчуць эфект падманутага чакання.

Амфітэза грунтуецца на сцвярджэнні супрацьлеглых з'яў ці прымет, у выніку чаго яны ахопліваюцца поўнасцю, прычым "супрацьпастаўленыя кампаненты ў структуры амфітэзы звязаны спалучальным злучнікам *і*, які можа паўтарацца, і выступаюць у

абагульняльным значэнні” [3, с. 12]: *Ляцяць – / праз леты… зімы… / о птахі, – /* ***дзень і год…*** */ Ім не зямля радзіма****,*** *радзіма ім палёт* [2, с. 15].

Антыменабала “заснавана на антонімах, якім уласціва перамена пазіцый і сінтаксічных функцый” [4, с. 32] пры паўторы: *Развей няведання туман / і адкажы нам, / непазбежнае, /* ***ці гэта час належыць нам****, /* ***ці гэта мы яму належныя****?* [2, с. 8].

Акратэза “сцвярджае адну з прымет, з’яў ці дзеянняў аб’ектаў рэчаіснасці шляхам адмаўлення супрацьлеглага” [4, с. 32]. Т.Я. Старасценка вылучае такія мадэлі рэалізацый акратэзы, як **не А, а $A^1$** і **А, а не $A^1$**. У пункцірах А. Разанава намі былі выяўлены выпадкі, што адпавядаюць толькі адной мадэлі – **не А, а $A^1$ (не А – $A^1$; не А, $A^1$)**: *Ды ёсць яшчэ прастор далёкі / і сцежка – доўгая, бы ўздых… / Ты сам з сабой* ***не адзінокі,*** */* ***а між людзей****: / куды ж ад іх?!* [2, с. 8].

Альтэрнатэза будуецца на альтэрнатыўным выбары аднаго з палярных прадметаў, з’яў, прымет, дзеянняў і грунтуецца на супрацьлегласцях, звязаных размеркавальнымі злучнікамі: *Вагаюцца цені ля вогнішча – / вырашаюць, / што лепей: /* ***згарэць ці застацца?*** [2, с. 83].

Дыятэза характарызуе сярэднюю ступень шляхам адмаўлення супрацьлеглых моўных адзінак, пры якіх прысутнічаюць часціцы **не, ні**, якія паказваюць на адмаўленне: ***Ні долаў, ні высяў*** *– / перамагліся: / кружляюць / арлы ў імгле* [2, с. 197].

Акрамя стылістычных фігур, А. Разанаў рэалізуе эфект падманутага чакання і на ўзроўні сінтаксічных канструкцый. Сярод іх намі былі вылучаны пункціры са структурай складаназлучанага сказа: *І сонца ўзышло, /* ***а*** *ўсё роўна свеціш, / неслух-маладзічок* [2, с. 97], складанага сказа з рознымі відамі сувязі: *Удзень авадні, / увечары камары, /* ***а*** *конь / пасвіцца: лета* [2, с. 166], і складаназалежнага сказа: *Як стары мудры вуж / шукае вузкае выйсце, / каб скінуць старую скуру – / так і я патаемнай вужовай натурай / шукаю сабе перашкоды, /* ***хоць*** *і пярэчыць гэтаму розум* [2, с. 24]. Эфект падманутага чакання дасягаецца з дапамогай злучальнай сувязі (супраціўныя злучнікі **а, але)**, а таксама з дапамогай падпарадкавальнай сувязі (злучнік **хоць)**.

**Такім чынам,** эфект падманутага чакання – адзін з выразных экспрэсіўных сродкаў, які стварае індывідуальны стыль выбітнага беларускага пісьменніка Алеся Разанава. Сродкамі выражэння эфекту падманутага чакання ў пункцірах з’яўляюцца як

стылістычныя фігуры кантрасту (аксюмаран, антытэза, амфітэза, антыменабала, акратэза, альтэрнатэза, дыятэза), так і сінтаксічныя канструкцыі (складаназлучаны сказ, складаны сказ з рознымі відамі сувязі, складаназалежны сказ).

## ЛІТАРАТУРА


1. Арнольд, И. В. Стилистика. Современный английский язык: Учебник для вузов / И. В. Арнольд. – 4-е изд., испр. и доп. – Москва : Флинта: Наука, 2002. – 384 с.

2. Разанаў, А. С. Такая і гэтакі: талакуе з маланкай дождж : пункціры / А. Разанаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2018. – 280 с.

3. Старасценка, Т. Я. Лексіка-стылістычныя сродкі рэалізацыі кантрасту (на матэрыяле твораў Алеся Разанава) : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : / Т. Я. Старасценка ; БДПУ імя Максіма Танка – Мінск, 2001. – 16 с.

4. Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў. У 12 т. Т. 7. Беларуская мова / рэдкал. : У.У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2017. – 496 с.



УДК 821.161.3’373.2



Навуч. Ю.В. Дземянік

Навук. кір. Ж.В. Шкодзіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры

(ДУА «Вучэбна-педагагічны комплекс Ханявіцкі дзіцячы сад-сярэдняя школа»)


## КАТАЙКОНІМЫ СВІСЛАЦКАГА РАЁНА ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ: СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ АНАЛІЗ

Значным накірункам сучаснай анамастыкі з’яўляецца вывучэнне асаблівасцей утварэння і функцыянавання назваў асоб паводле месца жыхарства. Катайконімы складаюць неад’емную частку словаўтваральнай сістэмы беларускай мовы.

Актуальнасць даследавання такіх намінацый вызначана іх неўнармаванасцю, варыятыўнасцю, цікавасцю як спецыфічнага разраду ў сістэме словаўтварэння.

Практычная значнасць – паглыбленне даследаванняў па тапаніміцы, гісторыі малой радзімы, выкарыстанне на факультатыўных занятках па беларускай, рускай мовах, гісторыі, літарату, як аснова для складання слоўніка катайконімаў.

Аб’ект даследавання – катайконімы Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці, прадмет даследавання – словаўтваральны аналіз назваў жыхароў пэўнай мясцовасці ў дадзеным рэгіёне.